# ГДУ ЗАПРАШАЕ ВАС, БУДУЧЫЯ СПЕЦЫЯЛІСТЫ!

Спецыяльны выпуск для юнакоў і дзяўчат, якія імкнуцца стаць высокакваліфікаванымі спецыялістамі.

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

Год выдання другі
№ 14 (72)
СУБОТА 17 КРАСАВІКА 1971 года

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

Цана 2 кап.



## ТАБЕ, АБІТУРЫЕНТ-71

Сённяшні нумар нашай газеты прысвячаецца абітурыентам — дапытлівым, настойлівым і працавітым юнакам і дзяўчатам, якія мараць стаць студэнтамі вну.

На старонках спецвыпуска «Гомельскага універсітэта» расказваецца аб ГДУ, аб кожным з яго 7 факультэтаў і спецыфіцы навучання на іх, аб умовах, у якіх студэнты жывуць і вучацца ва універсітэце.

Абітурыент знойдзе тут адказы на пытанні, звязаныя з правіламі прыёму ў ГДУ, наогул пазнаёміцца з тым, што ўяўляе сабой Гомельскі дзяржаўны універсітэт — адзін з самых маладых універсітэтаў у краіне.

ГДУ з радасцю пryме ў рады свайго студэнцтва кожнага, хто вырашыў прысвяціць сваё жыццё раскрыццю нязведаных таямніц навукі, хто горача імкнецца атрымаць вышэйшую адукацыю, каб у далейшым прынесці найбольшую карысць нашай Радзіме.

На здымках: новы і стары вучэбныя карпусы Гомельскага дзяржаўнага універсітэта.

**Развіваць вышэйшую і сярэднюю спецыяльную адукацыю ў адпаведнасці з патрабаваннямі навукова-тэхнічнага прагрэсу, павышаць якасць падрыхтоўкі і паляпшаць ідэйна-палітычнае выхаванне будучых спецыялістаў. Падрыхтаваць за пяцігоддзе прыкладна 9 мільёнаў спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, звярнуўшы асаблівую ўвагу на падрыхтоўку спецыялістаў па новых напрамках навукі і тэхнікі, для галін вытворчасці, якія хутка развіваюцца, і сферы абслугоўвання.**

З Дырэктыў XXIV з'езда КПСС па пяцігадоваму плану развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1971—1975 гады.



# УНІВЕРСІТЭТ ГЛЯДЗІЦЬ У ЗАЎТРА

У маі спаўняецца два гады з дня адкрыцця Гомельскага дзяржаўнага універсітэта. Тэрмін гэты невялікі для гісторыі вну. Але можна смела сказаць, што партыйная, прафсаюзная і камсамольская арганізацыі, увесь калектыў правялі значную работу па станаўленню другога ў Беларусі універсітэта. Аб гэтым сведчыць узросшы ідэйна-палітычны ўзровень нашых студэнтаў, працоўныя ўздым і поспехі ўсяго калектыву. Нягледзячы на сваю маладосць, універсітэт выйшаў па раду паказчыкаў на перадавыя пазіцыі не толькі ў рэспубліцы, але і сярод вну краіны.

Зараз ва універсітэце сем факультэтаў: фізічны, механіка-матэматычны, геалагічны, эканамічны, біёлага-глебавы, гісторыка-філалагічны і факультэт фізічнага выхавання. Амаль 3.000 студэнтаў вучацца на стацыянары і каля 2.000 завочна. За два гады прафесарска-выкладчыцкі састаў папоўніўся высокакваліфікаванымі спецыялістамі. Зараз свае веды і вопыт перадаюць студэнтам 18 дактароў навук, прафесараў і больш за 100 кандыдатаў навук. Сярод іх буйны спецыяліст па трэнню доктар тэхнічных навук, прафесар Д. М. Гаркуноў. Ён узначальвае адзіную ў краіне кафедру фізікі цвёрдага цела. Будучых геолагаў рыхтуюць прафесары А. Р. Кінзікееў і С. Д. Туроўскі, а біёлагаў — прафесары А. С. Паламарчук, П. В. Палятаеў і Ф. М. Харытановіч.

Узначальвае універсітэт член-карэспандэнт АН БССР, доктар тэхнічных навук У. А. Белы. ГДУ становіцца буйнейшым навуковым цэнтрам Палесся. Таму ў аснову яго навуковай праблематыкі пакладзены комплексныя праблемы вывучэння Палесся: яго мінеральна-сыравінныя рэсурсы, фауна і флора, эканоміка і культура, асаблівасці мовы і вусна-паэтычная творчасць.

Актывізуючы навуковую дзейнасць, кафедры універсітэта ўстанаўліваюць дзелавыя сувязі з прадпрыемствамі і гаспадаркамі вобласці, дапамагаюць ім у павышэнні эфектыўнасці вытворчасці, зніжэнні сабекошту прадукцыі.

Кафедры грамадскіх навук актыўна ўключыліся ў даследаванні, звязаныя з павышэннем эканамічнай эфектыўнасці вытворчасці.

Дзевятая пяцігодка з'явіцца новым этапам у развіцці нашай установы. Пачынаецца будаўніцтва новага 6-павярховага вучэбна-лабараторнага корпуса, спартыўнага комплексу з плавальным басейнам, 156-кватэрнага інтэрната і дома для супрацоўнікаў. А Маскоўскі інстытут «Гіправуз» прыступіў да праектавання універсітэцкага гарадка ў раёне Валатавы. Тут побач з універсітэцкімі карпусамі вырасце акадэмічны гарадок філіяла Акадэміі навук БССР. Каля 8.000 студэнтаў будуць займацца ў новых карпусах універсітэта на дзённым аддзяленні. Але гэта ў будучым. А зараз калектыў напружана працуе па выкананню рашэнняў XXIV з'езда КПСС.

Прафесарска - выкладчыцкі састаў актыўна ўдзельнічае ў правядзенні выязных пасяджэнняў вучоных саветаў факультэтаў і кафедр у розных раёнах Гомельшчыны. Яны выступаюць перад рабочымі, калгаснікамі, інтэлігенцыяй па актуальных пытаннях тэорыі і практыкі камуністычнага будаўніцтва, аказваюць практычную дапамогу прадпрыемствам і школам, калгасам і клубам.

Безумоўна, не ўсе праблемы развіцця і станаўлення універсітэта яшчэ вырашаны: пакуль не хапае вучэбных памяшканняў і лабараторый, адчуваецца патрэба ў высокакваліфікаваных кадрах выкладчыкаў. Аднак мы ўпэўнены, што наш універсітэт будзе рыхтаваць для краіны спецыялістаў толькі высокай кваліфікацыі.

**У. КАЗЛОЎ,**
сакратар парткома.

